БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 12 (94)
красавік
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

Віктар ВАРАБ'ЁЎ:

"Каб зімой было цёпла!"

с.4

Загадка

с.8

Старшыня

с.2

Размова

с.3

KAMUNIKAT.org

Чалавек з песеннага краю

Фота "Зямля і людзі"

Дзмітрый Дзмітрыевіч ГОБАРАЎ

АФІЦЫЙНА: *21 красавіка 2009 года сесія Магілёўскага раённага Савета дэпутатаў зацвердзіла Дзмітрыя Дзмітрыевіча ГОБАРАВА старшынёй Магілёўскага раённага выканаўчага камітэта.*

Усё пачынаецца з вытокаў. Той асяродак, у якім чалавек з'яўляецца на свет, робіць першыя крокі і гаворыць першыя словы, назаўсёды кладзецца адбіткам на ўсё жыццё. І калі хочаш зразумець чалавека, якога сустракаеш на сваім шляху, -- спытай, адкуль ён і дзе ягоныя карані.

...Ёсць у Касцюковіцкім раёне Магілёўскай вобласці вельмі незвычайнае месца -- вёска Саматэвічы. Незвычайнасць тых мясцін у занадта вялікай канцэнтрацыі высокай беларускай духоўнасці на параўнальна невялікай па памерах тэрыторыі: у Саматэвічах нарадзіўся народны паэт Беларусі Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў; суседняя веска Бялынкавічы -- радзіма выдатнага паэта Алеся Уладзіміравіча Пісьмянкова; недалёка месціцца вёска Вялікі Бор, дзе нарадзіўся народны пісьменнік Беларусі Іван Гаўрылавіч Чыгрынаў; побач вёска Клеявічы, адкуль родам вядомы празаік Леанід Кірэевіч Левановіч (Лявонаў)... Шчыра кажучы, на Магілёўшчыне больш няма мясцін з такім вялікім духоўным патэнцыялам. Відаць, недзе ў нябёсах *так* сышліся зоркі, што менавіта гэты куток Беларусі такі незвычайны.

І вось тут, у вёсцы Саматэвічы, 7 лістапада 1962 года нарадзіўся Дзмітрый Дзмітрыевіч Гобараў -- новы кіраўнік нашага Магілёўскага раёна. Ён ведае сялянскае жыццё, як гаворыцца, з "азоў", прайшоў вялікі працоўны шлях -- ад рабочага паляводчай брыгады саўгаса да старшыні райвыканкама найбуйнейшага раёна Магілёўскай вобласці. Ён дзейны і дынамічны. Ён вялікі аптыміст і глыбока верыць у тое, што, негледзячы ні на якія акалічнасці, Беларусь абавязкова будзе моцнай і квітнеючай еўрапейскай краінай. А каб так было, трэба працаваць -- самааддана і ўзнёсла.

І я чамусьці перакананы ў тым, што менавіта зорны неруш родных саматэвіцкіх абсягаў заўсёды дапамагае Дзмітрыю Дзмітрыевічу на ягоных жыццёвых шляхах, акрыляе яго і дае яму ўпэўненасці. Дай жа, Бог, каб і нашы прыдняпроўскія палеткі паклаліся звонкай песняй на ягонае сэрца.

У добры шлях, старшыня!

Мікола ЯЦКОЎ,
член Саюза беларускіх пісьменнікаў.

27 красавіка 2009 г.
свой першы дзень
нараджэння адзначае
Аліна Міхайлаўна
КУЛЯШОВА.
Самы першы год жыцця --
заўсёды самы складаны.
У некаторых народаў існуе
традыцыя урачыста адзначаць толькі дзве гадавіны
з дня нараджэння --
першую і васемнаццатую.
Першая -- вось яна,
а да той -- рукой падаць.
Расці вялікай, Аліна!
Віншуем!

Адказы на пытанні

Надзея Стэфанаўна Мяшкова з'явілася на свет на гэтай брылеўскай вуліцы. Тут стаіць бацькоўская хата. Менавіта тут малая радзіма Надзеі Стэфанаўны. І ёй вельмі хочацца, каб гэты радзінны куток быў чыстым, утульным і самым прыгожым. Шмат што гэтая энэргічная жанчына робіць сама, сваімі рукамі. А калі не хапае магчымасцей, звяртаецца да мясцовага кіраўніцтва, і ў першую чаргу да свайго дэпутата сельсавета Алы Міхайлаўны Яцковай і да старшыні сельсавета Уладзіміра Ільіча Мажорава. Вось і зараз трэба вырашыць праблему ліквідацыі вялікага сметніка ў самым цэнтры вуліцы Палявой. І 23 красавіка 2009 г. па просьбе Н.С.Мяшковай і У.І.Мажораў, і А.М.Яцкова сюды прыехалі -- каб на месцы прааналізаваць сітуацыю і спланаваць патрэбныя дзеянні. Пасля візуальнага агляду было вырашана правесці ўборку гэтай тэрыторыі. Мясцовы жыхар Аляксандр Аляксандравіч Іваноў выказаў жаданне зрэзаць увесь туташні хмызняк, -- і літаральна на наступны дзень зрабіў гэта. Ветэраны працы Аляксандр Арцёмавіч і Галіна Васільеўна Карнеевы паабяцалі дапамагчы ў добрай справе і ў дадатак да гэтага пытання звярнулі ўвагу на дрэнны стан дарогі на скрыжаванні ля іх дома... Адным словам, размова атрымалася. І ёсць спадзяванне, што сказаныя словы абавязкова напоўняцца станоўчым практычным зместам.

Мікола ЯЦКОЎ.

У.І.Мажораў, А.М.Яцкова і Н.С.Мяшкова

У.І.Мажораў: *"Звярніце ўвагу на гэта..."*

А.А.Карнееў: *"А вунь там трэба да розуму давесці!"*

А.М.Яцкова: *"А што, калі нам зрабіць вось так..."*

А.А.Іваноў

А.М.Яцкова і Г.В.Карнеева

Н.С.Мяшкова: *"На нашай вуліцы павінен быць парадак!"*

Фотаздымкі Міколы Яцкова

Зіма не за гарамі

Яшчэ далёка не адышлі ўспаміны пра зіму, а ля брылеўскай кацельнай пачалася падрыхтоўка да новага ацяпляльнага сезона. Адна за другой ідуць машыны і трактарныя прычэпы з лясным сухастоем. Усе працаўнікі брылеўскага ўчастка ЖКГ на чале з А.М.Сілковым самааддана працуюць. Звініць бензапіла. Папіленыя чурбакі складваюцца ў высокія бурты. Паступова тэрыторыя ля кацельнай будзе запоўнена сыравінай, неабходнай для бесперабойнай працы катлоў у зімовых умовах. Можна быць упэўненымі, што ў гэтым сектары брылеўскага жыццезабеспячэння усё будзе зроблена дакладна і ў вызначаныя тэрміны.

Мікола ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі аўтара (21-24.04.2009 г.)

Двор ля кацельнай адпавядае ўсім стандартам пажарнай бяспекі.

Механізаванае падраздзяленне раённай ЖКГ займаецца падвозкай бярвенняў.

Віктар Вараб'ёў, Аляксандр Сілкоў, Леанід Баранаў і Уладзімір Іваноў робяць дрывяныя бурты.

Унук

Брылеўцы Міхаіл Анатольевіч і Жана Люцыянаўна Жылінскія ў гэты пагодлівы красавіцкі дзень атрымалі магчымасць адчуць на сабе цеплыню двух сонейкаў. Адно, як і заўсёды, свяціла з веснавога неба. А вось другое ўладкавалася ў іх на руках. І завуць гэтую светлую з'яву Уладзіслаў. Ён самы першы ўнук дзеда Мішы і бабы Жаны. Ён сур'ёзна ўглядаецца ў гэты свет, і, здаецца, вельмі добра разумее, што сваёй іскравай усмешкай будзе заўсёды саграваць сэрцы тых, для каго ён самы даражэнькі і самы непаўторны.

Ала ЯЦКОВА.

Фота М.Яцкова.
8.04.2009 г.

Сакавіты сметнік

Брылеўскі парк карыстаецца вялікай палулярнасцю сярод значнай часткі мясцовага насельніцтва. Як толькі надыходзіць час веснавой сакавітасці, на бярозы чапляюцца вось такія ўнушальныя ёмістасці, выробленыя з вялікай тэхнічнай выдумкай (здаецца, можна патэнтаваць вынаходніцтвы). З першых цёплых дзён і да самой глыбокай восені з цёмных паркавых глыбінь даносіцца розгалас сяброўскіх кампаній і вясёлае дзыньканне спусташаемага посуду. Вядома, пасля такіх гулянак застаецца шмат смецця, якое практычна ніколі не прыбіраецца. І паступова наш парк прымае выгляд нейкага грандыёзнага сметніка.

Плантацыя

Праблема? Безумоўна. Хто павінен яе вырашаць? Сельсавет? Камунгасаўцы? Экалагічныя службы? І наогул -- чыя гэта зямля?..

Пакуль разбяруцца ў гэтых хітраспляценнях, хочацца проста папрасіць усіх патэнцыяльных адпачываючых з павагай ставіцца да гэтага прыгожага месца і прыбіраць за сабой. Няўжо так цікава ладзіць пікнікі на сметніку і сядзець у гэтым брудзе?..

А ў Расіі абаронцы прыроды распаўсюджваюць вось такія гучныя аб'явы. Актуальна!.. *М. Я.*

Ці то парк, ці то сметнік...

"Антыкрот"

Цікавае прыстасаванне для адпужвання кратоў можна ўбачыць на сядзібе брылеўца Аляксандра Міхайлавіча Ярмаша: на металічныя штыры, што натыканы па ўсёй тэрыторыі, чапляюцца металічныя банкі з-пад піва. Ад ветру ўсё гэта тахкае адно аб адно -- і ніводнага крата нідзе не відаць. Сціпла, танна і дзейсна. Рэкамендуем!

Адлюстраванні

І дрэвы глядзяцца ў люстэрка Рудэі,
І сонца плыве ў патаемных вірах...

Фотаздымкі Вольгі Майбуравай.

9.04.2009 г.

Красавік на Кастрычніцкай

Калі ідзеш па вуліцы Кастрычніцкай ў Брылях ля Смаляковых і Лусцянковых, то такое ўражанне, што тут насамрэч і не вуліца, а футбольнае поле з вельмі добрым пакрыццём, -- так добра ўсё тут даглядаецца.

Калі людзі жадаюць жыць сярод прыгажосці, то ніякія ўказы і загады ім не патрабуюцца.

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

МВ Магілёўскія ведамасці

18.04.2009 г.

Председатель Шкловского райисполкома Александр БОЙКО: "В РАБОТЕ КОМ - ПРОМИССОВ НЕ БЫВАЕТ".

Александр Бойко

«...Нужно сказать, что Шкловский район достиг определённого уровня в своём развитии. Причём с положительной динамикой. И этот уровень нужно не только поддерживать, но и двигаться вперёд, невзирая ни на какие мировые кризисы. Тем более что на дворе четвёртый, решающий год очередной пятилетки. И те задачи, которые поставлены перед нами, те прогнозные показатели по году и пятилетию в целом, доведённые до района, мы обязаны выполнить. На это нацелен каждый труженик района».

Беларусь сегодня СБ

16.04.2009 г.

Известный белорусский экономист Аляксандр ЛУЧЕНОК задаёт вопрос: *НАДО ЛИ ПЛАНИРОВАТЬ ВАЛ?*

Александр Лученок

«...В административной системе оценить работу руководителя проще всего по выполнению доведённых ему показателей. Кроме того, быстрое увеличение объёмных показателей у нас принято считать свидетельством эффективности экономической системы. Исполнители привыкли к объёмным показателям и научились с ними справляться. Отработанные за годы директивной советской экономики приёмы не забыты и успешно используются.

Плановые («прогнозные») показатели практически никогда не устанавливаются путём тщательного подсчёта имеющихся резервов. Поэтому показатели устанавливаются «от достигнутого»: к базовому уровню добавляют процент прироста и получают «прогнозную» цифру. Но умный директор базовый уровень заранее занизит и тем самым облегчит себе жизнь.

Из теории известно, что в экономической системе, эффективность которой оценивается исходя из выполнения доводимых показателей, резко возрастает склонность к искажению информации в сторону её приукрашивания. А как же иначе: за плохие результаты не только премии, но и работы лишат...

Пора отказываться от объёмных показателей и заняться реальным повышением эффективности хозяйствования во всех звеньях. При этом нужно менять систему управления экономикой: производить не ради выполнения показателей, а исходя из реального спроса. И главное в этом направлении -- создать такие условия хозяйствования, чтобы люди работали не из-под директивной палки, а исходя из выгоды как для государства, так и для себя».

Цытата

Бываюць цяжкія хвіліны, але супраціўляйся ім – павярніся да дрэннага спіной, і твая ўнутраная вясна не абмане цябе. Нават старасць і тая не заўсёды згінаецца пад халодным змрокам ночы.

Лукрэцый Ціт (I ст. да н.э.), рымскі паэт і філосаф.

Народная газета

5.02.2009 г.

СВЕТ МОЙ, ЗЕРКАЛО...

Способность отражать реальный мир наделила зеркало многими свойствами и качествами. Наши предки наделяли его сверхъестественной силой и считали, что в зеркале можно увидеть прошлое, настоящее и будущее.

- У староверов зеркало считалось запретной вещью, созданной дьяволом.
- Когда в доме умирал человек, необходимо было завесить или перевернуть зеркало к стене. Считали, что смерть «удвоится» в зеркале, т.е заберёт кого-то ещё, как правило, того, кто первый посмотрится в это зеркало.

- Зеркала в доме оставались закрытыми до момента выноса тела и погребения, иногда -- до 9 или 40 дней после смерти, реже - на протяжении всего поминального года.
- Считалось, что нечистая сила утрачивает свою способность творить зло и вредить человеку, если отразится в зеркале. Поэтому вместе с другими оберегами небольшое зеркало как оберег от нечистой силы клали в колыбель к ребёнку, носили в кармане, вешали в хлеву.
- Традиция размещать зеркало в непосредственной близи от входной двери объясняется тем, что нечистая сила не пожелает «отразиться», значит, погибнуть, и не войдёт в дом.
- Именно зеркало чаще всего использовали в гаданиях. Для этого надо было на Святки с закатом солнца вне дома (например, в бане или пустом доме) заглянуть в зеркало, чтобы увидеть суженого.

Прозвішча падпісчыка

САБАКА БАСКЕРВІЛЯЎ ПА-БРЫЛЕЎСКУ

Сэр Артур Конан Дойл

Шмат пакаленняў прыхільнікаў дэтэктыўнага жанра літаральна зачытваліся кнігамі англійскага пісьменніка сэра Артура Конана Дойла. Галоўны герой ягоных гісторый Шэрлак Холмс развязвае самыя складаныя крымінальныя вузлы. Аднойчы ён разабраўся з таемным сабакам Баскервіляў, які наводзіў жах у адной з мясцовасцей Англіі. Думаецца, з не меншай цікавасцю паставіўся б вядомы сышчык і да выпадку, які адбыўся ў Брылях у ноч на 20 красавіка 2009 г. Тут у пад’ездзе дома № 6 па вуліцы Юбілейнай уваходныя дзверы раптам займелі вось такі страшненькі выгляд *(гл. фота)*. Як высветлілася, у пад’езд забег нечый сабака, а нехта з жыхароў, не ведаючы пра гэта, зачыніў дзверы на замок. Сабаку праз каторы час захацелася выйсці на двор, а тут - бац! - зачыненыя дзверы. А зубы на што? Правільна: пачаў той зубасцік грызці перашкоду. І выгрыз бы скразную дзірку, але ж звонку дзверы жалезныя. А з жалезам ваяваць -- ніякіх зубоў не хопіць. Давялося чакаць ранку. А там ішоў жыхар пад’езда Аляксандр Капытаў, які і выпусціў на волю зубастага бедалагу. Дарэчы, Аляксандр, убачыўшы вынікі начной атакі, узяў у рукі малаток з цвікамі і надаў дзвярам даволі прыстойны выгляд. А мы, жартоўна успомніўшы ў сувязі з гэтым вядомую дэтэктыўную гісторыю, можам сур’ёзна дадаць, што імкненне да свабоды -- з’ява натуральная, на ўзроўні інстынктаў. І аб гэтым трэба заўжды помніць.

Мікола ЯЦКОЎ.

Задача амаль для Шэрлака Холмса....



Ілюстрацыя да аповесці “Сабака Баскервіляў”

Здаецца, і па Брылях бегала нешта вось такое...

Залатаныя дзверы

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© “Брылеўскі летапіс”, 2009

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ